Источник: "Беларусь" - №2, 2018-02-26





# ЛІЧБЕ ПЕРАКЛАД НЕ ПАТРЭБНЫ

**“Калі XIX стагоддзе было стагоддзем імперый, а XX — стагоддзем нацыянальных дзяржаў, то XXI стагоддзе стане эпохай гарадоў”, — гаворыць віцэ-прэзідэнт IBM па напрамку “Разумны горад” Джэры Муні. Гаворка ідзе аб развіцці лічбавай эканомікі — трэндзе, якога Беларусь прытрымліваецца ўжо не першы год. Эканамічная стабілізацыя, не толькі садзейнічае гэтаму, але і адкрывае новыя магчымасці.**

Такім чынам, глабальны эканамічны крызіс у мінулым. Як вынік усе індыкатары развіцця прыйшлі ў рух. ААН адзначае, што сусветныя цэны на харчаванне падскочылі да максімуму — добрая вестка для нашых экспарцёраў. Белстат гаворыць, што валавы ўнутраны прадукт Беларусі па выніках 2017-га вырас на 2,4 працэнта — больш, чым планавалася першапачаткова. Што наперадзе?

Як мінімум — працяг тэндэнцыі росту ВУП. Усе падставы бачыць для гэтага дырэктар Інстытута эканомікі НАН Валерый Бельскі:

— Павялічваюцца інвестыцыі ў беларускую эканоміку. Растуць спажывецкі попыт, прадукцыйнасць працы і рэальныя грашовыя даходы насельніцтва. Стабілізавалася сітуацыя пасля даволі складанага перыяду на рынку нашага асноўнага гандлёва-эканамічнага партнёра — Расійскай Федэрацыі, попыт ажывае. Немалаважным фактарам для росту нашай эканомікі з’яўляецца стабілізацыя цэн на энерганосьбіты на сусветным рынку, што будзе спрыяць павелічэнню даходаў беларускіх нафтаперапрацоўчых заводаў.

Больш аддаленую перспектыву — на стыку цяперашняй і будучай пяцігодак — малюе Міністр эканомікі Уладзімір Зіноўскі. З яго прагнозаў вынікае, што леташні рэкордна нізкі ўзровень інфляцыі ў нашай краіне (4,6 працэнта) — зусім не мяжа:

— У ідэале інфляцыя павінна быць 2-3 працэнты, не больш. Гэта дасць магчымасць яшчэ больш знізіць стаўку рэфінансавання і працэнты па крэдытах. Мне падаецца, што мы проста абавязаны будзем у 2020-2021 гадах выйсці на гэтыя лічбы.

Акрамя відавочнага запаволення росту цэн і павышэння даступнасці крэдытаў, гэта пазітыўна адаб’ецца і на сітуацыі ў сферы занятасці. Напрыклад, прадоўжыцца працэс стварэння новых працоўных месцаў у дзяржсектары. Асаблівая роля пры гэтым адводзіцца Дэкрэту № 8 “Аб развіцці лічбавай эканомікі”. Сэнс гэтага дакумента, разважае Міністр эканомікі, не толькі ў развіцці IT-сферы:

— З прыняццем дэкрэта ў нас створаны спрыяльныя ўмовы для пранікнення інфармацыйных тэхналогій у прамысловасць, сельскую гаспадарку і сацыяльную сферу і стварэння на іх аснове новых бізнес-мадэляў.

Найбольш значныя сацыяльныя напрамкі развіцця лічбавай эканомікі — ахова здароўя, адукацыя. І згаданыя спачатку разумныя гарады. Пакуль такіх не так шмат, месцы рэалізацыі такіх праектаў можна пералічыць па пальцах: Амстэрдам, Барселона, Брусэль, Вена, Нью-Ёрк, Сеул, Токіа, Шанхай. Але ў маі ў Мінску плануецца правесці лічбавы форум краін Еўразіі. Мэта — развіццё розных формаў дзяржаўна-прыватнага партнёрства, гарманізацыі нацыянальных лічбавых рынкаў краін Еўропы і Азіі. А таксама паэтапнае фарміраванне пан’еўразійскай лічбавай рыначнай прасторы. Эканамічная стабілізацыя плюс лічбавізацыя — чым не формула для перспектыўнага развіцця Беларусі?

Максім **Осіпаў**



Максім Осіпаў. Лічбе пераклад не патрэбны